# ДАВЕДНІК
## па **экзамене васьмікласніка** па **гісторыі**

ад 2021/2022 навучальнага года

**Цэнтральная экзаменацыйная камісія**
**Варшава 2020**

## Рэдакцыйная група:

Марэк Зялінскі (ЦЭК)
Анджэй Баброў (АЭК Ломжа)
Сільвія Дэрда (АЭК Варшава)
Эльвіра Гурчак-Ульман (АЭК Гданьск)
др Якуб Лоранц
др Пётр Падэмскі
др Віялета Козак (ЦЭК)
др Марцін Смолік (ЦЭК)

## Рэцэнзенты:

др габ. Іяланта Хаінска-Міка, праф. ВУ
др габ. Іяланта Войдан, праф. УрУ
др Тамаш Карповіч (моўная рэцэнзія)

Даведнік распрацаваны Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіяй ў супрацоўніцтве з акруговымі экзаменацыйнымі камісіямі.


Цэнтральная экзаменацыйная камісія
ul. Józefa Lewartowskiego 6, 00-190 Warszawa
tel. 22 536 65 00
sekretariat@cke.edu.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ў Гданьску
ul. Na Stoku 49, 80-874 Gdańsk
tel. 58 320 55 90
komisja@oke.gda.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ў Явожна
ul. Adama Mickiewicza 4, 43-600 Jaworzno
tel. 32 616 33 99
oke@oke.jaworzno.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ў Кракаве
os. Szkolne 37, 31-978 Kraków
tel. 12 683 21 01
oke@oke.krakow.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ў Ломжы
al. Legionów 9, 18-400 Łomża
tel. 86 216 44 95
sekretariat@oke.lomza.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ў Лодзі
ul. Ksawerego Praussa 4, 94-203 Łódź
tel. 42 634 91 33
sekretariat@lodz.oke.gov.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ў Познані
ul. Gronowa 22, 61-655 Poznań
tel. 61 854 01 60
sekretariat@oke.poznan.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ў Варшаве
pl. Europejski 3, 00-844 Warszawa
tel. 22 457 03 35
info@oke.waw.pl

Акруговая экзаменацыйная камісія ва Уроцлаве
ul. Tadeusza Zielińskiego 57, 53-533 Wrocław
tel. 71 785 18 94
sekretariat@oke.wroc.pl

# Змест

**1.** Апісанне экзамену васьмікласніка па гісторыі ........................................ **5**
Уступ ........................................................................................ **5**
Экзаменацыйныя заданні.................................................................. **5**
Апісанне экзаменацыйнага аркуша........................................................ **6**
Прынцыпы ацэньвання..................................................................... **6**

**2.** Прыклады заданняў з рашэннямі.......................................................... **9**
Заданні з аргументаваннем................................................................. **56**

# 1. Апісанне экзамену васьмікласніка па гісторыі

## Уступ

Гісторыя з’яўляецца адным з прадметаў па выбары на экзамене васьмікласніка.

Экзамен васьмікласніка па гісторыі дазваляе праўдзіць, у якой ступені вучань VIII класа базавай школы адпавядае патрабаванням, акрэсленым у агульнаадукацыйнай базавай праграме для II этапу адукацыі: IV–VIII класы.

У *Даведніку* падаюцца ўзоры экзаменацыйных заданняў разам з рашэннямі, а таксама акрэсліваецца суаднесенасць заданняў з патрабаваннямі базавай праграмы. Прапанаваныя ў *Даведніку* заданні не адлюстроўваюць усіх патрабаванняў па гісторыі, акрэсленых у базавай праграме, а таксама не адлюстроўваюць усіх тыпаў заданняў, што могуць з’явіцца ў экзаменацыйным аркушы. Толькі рэалізацыя ўсіх патрабаванняў базавай праграмы, як агульных, так і адмысловых, можа запэўніць адпаведную гістарычную адукацыю вучняў, у тым ліку іх належную падрыхтоўку да экзамену васьмікласніка[1].

## Экзаменацыйныя заданні

У экзаменацыйным аркушы знаходзяцца заданні як закрытага, так і адкрытага тыпу.

У заданнях закрытага тыпу вучань выбірае адказ з прапанаваных варыянтаў. Сярод заданняў такога тыпу –

- заданні множнага выбару;
- заданні тыпу “праўда-няпраўда”;
- заданні на падбор.

Заданні адкрытага тыпу прадугледжваюць самастойнае фармуляванне вучнем адказу. Сярод заданняў такога тыпу –

- заданні з пропускамі, у якіх трэба дапоўніць сказ або кароткі тэкст адным ці некалькімі словамі;
- заданні кароткага адказу, у якіх трэба напісаць кароткі тэкст.

Пры дапамозе экзаменацыйных заданняў будзе правярацца ўзровень валодання ўменнямі, апісанымі ў наступных агульных патрабаваннях агульнаадукацыйнай базавай праграмы:

- гістарычная храналогія;
- аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя;
- стварэнне гістарычнага наратыву.

У экзаменацыйных заданнях асаблівы акцэнт будзе зроблены на праверцы навыкаў крытычнага аналізу інфармацыі з розных крыніц і фармулявання высноў, умення

[1] Настаўнік гісторыі абавязаны рэалізаваць увесь матэрыял, прадугледжаны базавай праграмай, **перад** экзаменам.

прадстаўлення аргументаў на карысць уласнай пазіцыі наконт гістарычных працэсаў і постацяў, а таксама здольнасці размяркоўваць гістарычныя працэсы, з'явы і факты па часе (г.зн., звязаць іх з адпаведнымі перыядамі, упарадкаваць іх у храналагічным парадку, а ў меншай ступені – прыпісаць ім дакладныя гадавыя ці дзённыя даты).

## Апісанне экзаменацыйнага аркуша

Экзамен васьмікласніка па гісторыі доўжыцца 90 хвілін[2].

Заданні розныя паводле зместу, праверкі навыкаў, а таксама паводле ўзроўню складанасці і формы адказаў. У першую чаргу, правяраюцца складныя здольнасці – аназіз, параўнанне, высновы, абагульненні. Заданні могуць паасобныя і аб'яднаныя ў тэматычныя блокі; яны датычаць розных эпох, разнастайныя па тэматыцы і адсылцы да крыніц, у тым ліку тэкстаў, іканаграфічных і картаграфічных матэрыялаў, генеалагічных схем і статыстычных звестак.

Колькасць заданняў і колькасць балаў, якія можна атрымаць за паасобныя тыпы заданняў, падаецца ў наступнай табліцы.

| Від заданняў | Колькасць заданняў | Агульная колькасць балаў | Удзел у сумарным выніку |
|---|---|---|---|
| закрытага тыпу | 15–17 | прыблізна 17 | прыблізна 50% |
| адкрытага тыпу | 9–11 | прыблізна 17 | прыблізна 50% |
| **РАЗАМ** | **24–28** | **34** | **100%** |

## Прынцыпы ацэньвання

### Заданні закрытага тыпу і адкрытага тыпу з пропускамі

Заданні закрытага і адкрытага тыпу, а таксама заданні з пропускамі ацэньваюцца зыходзячы з максімальнай колькасці балаў, што можна атрымаць за рашэнне дадзенага задання – у адпаведнасці з наступнымі прынцыпам:

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

*АБО*

2 балыы – два правільныя адказы.
1 бал – адзін правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

[2] Час экзамену можа быць павялічаны для вучняў з адмысловымі адукацыйнымі патрэбамі, у тым ліку для асоб з няспраўнасцю, а таксама для іншаземцаў. Падрабязная інфармацыя знаходзіцца ў *Камунікаце дырэктара Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіі адносна дакладных спосабаў дастасоўвання ўмоў і формаў правядзення экзамену васьмікласніка* ў дадзеным навучальным годзе.

**Заданні адкрытага тыпу з кароткім адказам**

За рашэнне адкрытага задання з кароткім адказам можна атрымаць ад 0 да 3 балаў.

Прынцыпы ацэньвання будуць асобна апрацаваныя для кожнага задання. За кожнае правільнае рашэнне, якое адрозніваецца ад апісанага ў прынцыпах ацэньвання, можна даць максімальную колькасць балаў – пры ўмове, што гэтае рашэнне слушнае па сваёй сутнасці, адпавядае ўмове і зместу задання.

# 2. Прыклады заданняў з рашэннямі

У *Даведніку* для кожнага задання пададзеныя:

- колькасць балаў, якія можна атрымаць за рашэнне (непасрэдна пасля нумару задання);
- найважнейшыя агульныя і адмысловыя патрабаванні, што правяраюцца ў гэтым заданні;
- прынцыпы ацэньвання рашэння;
- правільнае рашэнне кожнага задання закрытага тыпу і варыянты рашэння кожнага задання адкрытага тыпу.

## Тэксты да заданняў 1 і 2.

**Тэкст I**

Памкнуліся ў два бакі нязгодныя багі:
Да флоту – Гера і можная Палада
Земляўзрушны Пасейдон, чыйго над марамі ўлада,
За Трояй – узброены Арэс і Феб доўгавалосы,
Артэміда, што ў забавах са стрэламі цешыць сэрца.

На падставе: *Lekcje ze źródłami. Starożytność*, red. K. Dyba, Warszawa 2000.

**Тэкст II**

Паклікаў Майсей увесь Ізраіль і сказаў ім: слухай, Ізраіле, пастановы і законы, якія я сёньня скажу ў вушы вашыя. Я стаяў паміж Госпадам і вамі ў той час, каб пераказваць вам слова Гасподняе. Ён тады сказаў: „Я Госпадзь, Бог твой, які вывеў цябе з зямлі Егіпецкай, з дому рабства. Хай ня будзе ў цябе іншых багоў прад абліччам Маім”.

На падставе: *Біблія. Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету. Кананічныя. У беларускім перакладзе*, World Wide Printing Duncanville USA, 2002.

**Тэкст III**

Я – творца неба і зямлі. Я зрабіў горы і ўсё тое, што існуе на зямлі. Я – творца вод. Я стварыў нябёсы. Па маёй волі хаваюцца два боствы далягляду. Я той, які загадвае – і цякуць воды Ніла. Я – прычына паводак. Я раніцай Хепры, упоўдні Рэ, вечарам Атум.

На падставе: J. Lipińska, M. Marciniak, *Mitologia* […], Warszawa 1980.

**Тэкст IV**

Я памятаю, як зямля прыняла Сатурна,
Выгнанага Юпітэрам з нябеснага царства.
Народ доўга зваўся сатурніянскім. Лацыа зямлю
Назвалі, таму што бог тут схаваўся.

На падставе: Z. Kubiak, *Mitologia* […], Warszawa 1997.

## Заданне 1. (0–1)

**Закончы сказ. З прапанаваных варыянтаў выберы адпаведны адказ .**

Монатэістычная рэлігія была апісана ў

**A.** тэксце I.
**B.** тэксце II.
**C.** тэксце III.
**D.** тэксце IV.

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

I. Старажытныя цывілізацыі. Вучань:
3) характарызуе […] рэлігію старажытнага Ізраіля […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Рашэнне

B

## Заданне 2. (0–1)

**З прыведзеных ніжэй назваў цывілізацый, пазначаных літарамі A – D, выберы тую, прадстаўнікі якой стварылі, адпаведна, тэксты I і IV. У кожным радку табліцы ўпішы правільную літару.**

**A.** цывілізацыя старажытнай Месапатаміі
**B.** цывілізацыя старажытнага Рыма
**C.** цывілізацыя старажытнага Егіпта
**D.** цывілізацыя старажытнай Грэцыі

| Тэкст | Цывілізацыя |
|---|---|
| I | |
| IV | |

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

I. Старажытныя цывілізацыі. Вучань:

3) характарызуе […] сістэму веraванняў у […] Грэцыі і Рыме […];

5) характарызуе найважнейшыя дасягненні духоўнай культуры […] старажытнага свету ў розных галінах […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае ўпісанне ўсіх літар.

0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне

I. D

IV. B

## Заданне 3. (0–1)

Старажытныя манеты

**A**



**B**



www.ngccoin.com

**Вырашы, на якой ілюстрацыі (A ці B) прадстаўлена манета, якая з’яўляецца матэрыяльным помнікам старажытнагрэчаскай цывілізацыі. Абгрунтуй адказ.**

Вырашэнне – ..........……………………………………………………………………..……

Абгрунтаванне – ……………………………………………………………………………...…

………………………………………………………………………………………………………

## Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

## Адмысловае патрабаванне

I. Старажытныя цывілізацыі. Вучань:

5) характарызуе найважнейшыя дасягненні матэрыяльнай культуры […] старажытнага свету ў розных галінах […].

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.

0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Рашэнне

Вырашэнне: манета B

Прыкладныя абгрунтаванні:

- На манеце B бачныя грэчаскія надпісы.
- На манеце B ёсць выява багіні Афіны.
- Манета A з’яўляецца рымскай, пра што сведчыць надпіс: “Roman”.
- На рымскай манеце A ёсць выява ваўчыцы з Ромулам і Рэмам – міфічнымі заснавальнікамі Рыма.

## Заданне 4. (0–1)

Крыніца 1. Карта




▬▬ – межы дзяржавы Мешка I напрыканцы яго панавання

▪▪▪▪▪▪ – межы дзяржавы Баляслава Храбрага напрыканцы яго панавання

На падставе: *Szkolny atlas historyczny*, Warszawa 2013.

Крыніца 2. Фрагмент хронікі

**Тэкст I**

30 студзеня, па загадзе імператара і пасля настойлівых просьбаў Баляслава, біскупы Геро і Арнульф, а таксама графы Герман і Тэадорык, як і імператарскі каморнік Фрыдрых, прысягнулі мір у горадзе, званым Будзішынам. Гэты мір быў не [такі], якім павінен быць, але такі, які ўдалося заключыць у тагачаснай сітуацыі.

На падставе: *Kronika Thietmara*, Kraków 2005.

**Тэкст II**

Баляслаў з вялікай сілай напаў на русінаў, а калі тыя, адразу паспрабаваўшы даць яму збройны адпор, усё ж не адважыліся выйсці на бітву, дык як віхура разганяе пыл, так ён разагнаў іх перад сабою. Без супраціву ўвайшоў ён у вялікі і багаты горад і, выцягнуўшы з похваў меч, ударыў ім аб Залатую браму.

На падставе: Anonim tzw. Gall, *Kronika Polska*, Wrocław 1982.

**Якія землі былі далучаныя Баляславам Храбрым у выніку падзеі, апісанай у тэксце I, а якія – у выніку падзей, апісаных у тэксце II? Да кожнага апісання дапасуй абшар на карце – выберы адпаведны з пазначаных на карце літарамі A – E. У кожным радку табліцы ўпішы адпаведную літару.**

| | | |
|---|---|---|
| **1.** | Абшар, далучаны да Польшчы ў выніку падзеі, апісанай у тэксце I. | |
| **2.** | Абшар, далучаны да Польшчы ў выніку падзей, апісаных у тэксце II. | |

## Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц (у тым ліку картаграфічных), спроба зрабіць на яе падставе высновы.
2. Лакалізацыя ў прасторы працэсаў, з’яваў і гістарычных фактаў з выкарыстаннем карт […] з розным маштабам.

## Адмысловае патрабаванне

V. Польшча ў перыяд ранніх Пястаў. Вучань:

3) характарызуе развіццё […] манархіі Баляслава Храбрага […].

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае ўпісанне ўсіх літар.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Рашэнне

1. B
2. D

## Заданне 5. (0–1)

Фрагменты хронік

Гал Ананім, *Польская хроніка*

Як жа дайшло да выгнання караля Баляслава з Польшчы, пра гэта доўга можна было б казаць; усё-ткі можна сказаць тое, што як памазанец божы не павінен быў іншага памазанца за ніводны грэх цялесна караць. Вялікую шкоду яму гэта прынесла, што грэхам на грэх адказаў і за здраду казаў адсячы біскупу члены ягоныя. Мы, аднак, ані апраўдваем біскупа-здрадніка, ані не хвалім караля, які так нягодна патрабаваў належнага.

На падставе: Anonim tzw. Gall, *Kronika polska*, Wrocław 1982.

Вінцэнт Кадлубак, *Польская хроніка*

О, сумнае, о найсумнейшае відовішча! Бязбожнік святога, злачынца міласэрнага, бязлітасны і жорсткі блюзнерца біскупа нявіннага разрывае, асобныя члены на найдрабнейшыя часціны рассякае, нібыта нават і асобныя часціны членаў мелі панесці

пакаранне. Пасля гэтага здарэння гэты вылюдак, агідны айчыне не менш, чым бацькам агідны, уцякае ў Венгрыю.

На падставе: Mistrz Wincenty Kadłubek, *Kronika polska*, Warszawa 2008.

**Пакажы розніцу паміж поглядам Гала Ананіма і Вінцэнта Кадлубка на канфлікт караля Баляслава Смелага з біскупам Станіславам. Дапоўні тэкст ніжэй.**

У той час, калі Гал Ананім мяркуе, што ……………………………………………………...…..

……………………………………………………………………………………..……..………...

……………………………………………………………………………………..……...……..,

Вінцэнт Кадлубак сцвярджае, што …………………………………………..……………

…………………………………………………………………………………….……………..

……………………………………………………………………………….………………… .

## Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы

## Адмысловае патрабаванне

V. Польшча ў перыяд ранніх Пястаў. Вучаць:

4) характарызуе […] развіццё дзяржавы Пястаў пад уладаю […] Баляслава Смелага.

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае дапаўненне тэксту.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Прыклады рашэння

- У той час, калі Гал Ананім мяркуе, што вінаватыя абодва бакі канфлікту, Вінцэнт Кадлубак сцвярджае, што вінаваты толькі адзін.
- У той час, калі Гал Ананім мяркуе, што біскуп здрадзіў дзяржаве, у выніку чаго кароль асудзіў яго на смерць, Вінцэнт Кадлубак сцвярджае, што кароль – вылюдак, а біскуп – ахвяра канфлікту.
- У той час, калі Гал Ананім мяркуе, што вінаватыя абодва бакі канфлікту, Вінцэнт Кадлубак сцвярджае, што біскуп Станіслаў не вінаваты ў развязванні канфлікту.

## Тэкст да заданняў 6 і 7.

Фрагмент гістарычнай працы

Арцыбіскуп Яніслаў памазаў Уладзіслава Лакатка і Ядзвігу ды надзеў ім кароны на галовы. Кароны былі новыя. Старую карону Пшэмыслава II забраў, імаверна, Вацлаў II. Незалежна ад гэтага, каранацыя Лакатка сталася звяном, што звязала мінуўшчыну з

будучыняй, а сам ход каранацыйнага абраду на Вавелі зрабіўся з гэтага часу абавязковым для наступных уладароў.

На падставе: J. Żylińska, […], Warszawa 1982.

## Заданне 6. (0–1)

**Ацані праўдзівасць прыведзеных сказаў. Выберы П, калі змест сказу адпавядае праўдзе, або Н – калі не адпавядае.**

| | | |
|---|---|---|
| Апісаная ў тэксце падзея адбылася ў другой палове XIV стагоддзя. | **П** | **Н** |
| У тэксце згадваюцца толькі ўладары з дынастыі Пястаў. | **П** | **Н** |

### Агульныя патрабаванні

I. Гістарычная храналогія.

4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

VI. Польшча ў перыяд удзельнай раздробненасці. Вучань:

5) характарызуе працэс аб'яднання польскай дзяржавы на мяжы XIII і XIV стагоддзяў, зазначаючы ролю ўладароў з дынастыі Пястаў (і асабліва ролю Уладзіслава Лакатка) […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.

0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне

НН

## Заданне 7. (0–1)

**Назаві горад, дзе адбылася каранацыя, апісаная ў цытаваным фрагменце тэксту.**

.............................................................................................................................................

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

VI. Польшча ў перыяд удзельнай раздробненасці. Вучань:

5) характарызуе працэс аб'яднання польскай дзяржавы на мяжы XIII і XIV стагоддзяў […].

### Прынцыпы ацэньвання
1 бал – правільна запісаная назва горада.
0 балаўаў – няправільны адказ або яго адсутнасць.

### Рашэнне
Кракаў

### Заданне 8. (0–1)



www.poznanskiehistorie.blogspot.com

**Запішы назву архітэктурнага стылю, да якога належыць будынак на выяве вышэй. Абгрунтуй адказ, называючы адну адметнасць стылю, якая бачная на ілюстрацыі.**

Назва архітэктурнага стылю – ……………………………………….……………..…………………..

Абгрунтаванне – …………………………………..………………..…………………………………

### Агульнае патрабаванне
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне
IV. Грамадства і культура сярэднявечнай Еўропы. Вучань:
3) […] распазнае помнікі сярэднявечнай культуры, паказвае розніцу паміж раманскім і гатычным стылямі.

**Прынцыпы ацэньвання**
1 бал – правільны адказ з абгрунтаваннем.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

**Рашэнне**
Назва архітэктурнага стылю: гатычны стыль (готыка)
Прыкладнае абгрунтаванне:

- вокны з завостраным верхам
- стральчатасць будынка.

## Генеалагічная табліца і тэкст да заданняў 9 і 10.

Крыніца 1. Генеалагічная табліца




* – народжаны/-ая † – памёр/-ерла
⚭ – шлюб

На падставе: *Encyklopedia popularna PWN*, Warszawa 2013.

Крыніца 2. Фрагмент прывілея

Сапраўдным дакументам, асабліва прагнучы ўзнагародзіць ласкавыя намеры, якія жыхары нашага польскага каралеўства паказалі маім сынам, высакародным князям

Уладзіславу і Казіміру, з якіх аднаго абяцалі пасля маёй смерці ўзяць сабе на свайго караля, прызнаем, узнаўляем і пацвярджаем на падставе дадзенага прывілея ўсе правы і свабоды, што мы ім надалі або якія іншыя каралі і князі надалі. Дазваляем пакінуць годнасці і духоўныя, і свецкія, на падставе тых самых правоў, якія яны мелі за папярэднікаў нашых, Казіміра і Людовіка.

На падставе: *Wiek V–XV w źródłach. Wybór tekstów źródłowych z propozycjami metodycznymi dla nauczycieli historii, studentów i uczniów*, oprac. M. Sobańska-Bondaruk, S.B. Lenard, Warszawa 1999.

## Заданне 9. (0–1)

**Вырашы, ці аўтарам дакумента быў манарх, які пачаў уладарыць у Польшчы ў выніку Крэўскай уніі паміж Польскім каралеўствам і Вялікім Княствам Літоўскім. Абгрунтуй адказ, спасылаючыся на інфармацыю з абедзвюх крыніц да задання.**

Вырашэнне: .......................................................................................................

Абгрунтаванне: ..................................................................................................

...........................................................................................................................

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

VII. Польшча ў XIV і XV стагоддзях. Вучань:

4) […] ацэньвае наступствы ўніі Польшчы з Вялікім Княствам Літоўскім;

7) характарызуе развіццё […] прывілеяў шляхецкага стану […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.

0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне

Вырашэнне: Так

Прыкладнае абгрунтаванне:

- Уладзіслаў Ягайла ўступіў на трон пасля Крэўскай уніі, а Казімір і Уладзіслаў – яго сыны.
- Уладзіслаў Ягайла ўступіў на польскі трон пасля Крэўскай уніі, а яго папярэднікамі былі Казімір Вялікі і Людовік Венгерскі.

## Заданне 10. (0–1)

**Ацані праўдзівасць прыведзеных сказаў. Выберы П, калі змест сказу адпавядае праўдзе, або Н – калі не адпавядае.**

| | | |
|---|---|---|
| Зацытаваны прывілей увёў у Польшчы прынцып свабоднага выбару манархаў. | **П** | **Н** |
| Інфармацыя з генеалагічных табліц з'яўляецца пацвярджэннем дынастычных сувязяў паміж Польшчай і Венгрыяй. | **П** | **Н** |

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

VII. Польшча ў XIV і XV стагоддзях. Вучань:

3) апісвае сувязі Польшчы з Венгрыяй у XIV і XV стагоддзях;

5) характарызуе дасягненні ў галіне унутранай і знешняй палітыкі Ягайлавічаў у XV стагоддзі.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне

НП

## Заданне 11. (0–1)

Франсуа Рабле, *Гарганцюа і Пантагруэль* (фрагмент)

Цяпер усе навукі адрадзіліся і зноў у пашане, уваскрэслі мовы: грэчаская, без якой сорамна хоць каму называцца вучоным, габрэйская, халдэйская, лацінская. Квітнее цудоўнае, удасканаленае друкарства, вынайдзенае калісьці дзякуючы божаму натхненню – так, як агнястрэльная зброя дзякуючы д'ябальскаму шэпту. Свет поўніцца вучонымі людзьмі, найлепшымі кнігарнямі, найсвятлейшымі настаўнікамі, і мне здаецца, што ані за Платона, ані за Цыцэрона не было такога спрыяння ў навуцы, як цяпер.

На падставе: *Wiek* […] *w źródłach. Wybór tekstów źródłowych z propozycjami metodycznymi dla nauczycieli historii i studentów,* oprac. M. Sobańska-Bondaruk, S.B. Lenard, Warszawa 1999.

**Вырашы, ці тэкст датычыць мяжы старажытнасці і Сярэднявечча ці Сярдэнявечча і Адраджэння. Абгрунтуй адказ.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

### Агульныя патрабаванні

I. Гістарычная храналогія.
   4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
   1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

IX. Залаты век у Польшчы на фоне Еўропы. Вучань:
   1) распазнае адметныя рысы еўрапейскага Адраджэння […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Прыклады рашэння

- Тэкст тычыцца мяжы Сярэднявечча і Адраджэння, таму што аўтар піша пра вынаходніцтвы з гэтага перыяду (напрыклад, друк, агнястрэльная зброя).
- Тэкст тычыцца мяжы Сярэднявечча і Рэнесансу, таму што ў ім ёсць згадка пра адраджэнне старажытнай культуры.

## Тэкст да заданняў 12 і 13.

Фрагмент гістарычнай працы

Няшмат было гадоў, у якіх – з-за чалавека ці прыроды – не здарылася нейкіх катастроф, што закраналі тую ці іншую частку латыфундыі. У інвентарах маёнтка Любамірскіх у Каньчузе занатавалі наступныя здарэнні:

1654: Размяшчэнне каралеўскай кавалерыі і нямецкіх палкоў; разрабаванне горада Каньчуга і вёскі Гаць.
1655: Размяшчэнне шведскіх войскаў.
1656: Рэквізіцыі каралеўскіх, шведскіх і сяміградскіх войскаў і казацкіх атрадаў.
1657: Рэквізіцыі сяміградскіх войскаў.
1689: Засуха. Неўраджай аўса, знішчэнне пасеваў.
1708–10: Вайсковыя кантрыбуцыі, пажары гумнаў.
1721: Пошасць.

На падставе: N. Davies, *Boże igrzysko. Historia Polski*, Kraków 2005.

## Заданне 12. (0–1)

**Ацані праўдзівасць прыведзеных сказаў. Выберы П, калі змест сказу адпавядае праўдзе, або Н – калі не адпавядае.**

| | | |
|---|---|---|
| Размяшчэнне шведскіх войскаў у маёнтку Любамірскіх было звязана з вайной – так званым “патопам”. | **П** | **Н** |
| Згаданыя ў тэксце *пажары гумнаў* і *пошасць* мелі месца ў часы панавання саксонскай дынастыі. | **П** | **Н** |

### Агульныя патрабаванні

I. Гістарычная храналогія.

4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

XI. Рэч Паспалітая і яе суседзі ў XVII стагоддзі. Вучань:

5) ацэньвае сацыяльныя і эканамічныя наступствы […] войнаў у XVII стагоддзі.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне

ПП

## Заданне 13. (0–1)

**Растлумач значэнне тэрміна *латыфундыя*.**

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

### Агульныя патрабаванні

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

III. Стварэнне гістарычнага наратыву.

2. Выкарыстанне гістарычных тэрмінаў і тлумачэнне іх значанняў.

### Адмысловае патрабаванне

XI. Рэч Паспалітая і яе суседзі ў XVII стагоддзі. Вучань:

5) ацэньвае эканамічныя наступствы […] войнаў у XVII стагоддзі.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Прыкладнае рашэнне

Латыфундыя – вялікае зямельнае ўладанне.

## Тэст і храналагічная стужка да заданняў 14 і 15.

Крыніца 1. Фрагмент рамана

– Ці ты паплыла б туды? – ён паказаў на плыт, што знікаў за паваротам.
– Сама не ведаю. Што б я там рабіла? А ты?
– За морам Швецыя. А шведы прыязныя каралю Станіславу. Калі б так жыў Карл XII…
– У нас цяпер міласцівы Аўгуст – азіраючыся, з трывогай нагадала Афра.
– Вядома. Саксонскія і рускія войскі дапамаглі яму ўсесціся на польскі трон. Але ён чужынец. А кароль Ляшчынскі свой. Толькі ён цяпер далёка…
– Далёка! – уздыхнула Афра. – У Францыі.
– А здраднікаў хапае. Напрыклад, вунь гэты – хлопец выцягнуў руку ў бок супрацьлеглага берагу, дзе паміж дрэвамі бялеў аздоблены калонамі франтон палаца.

На падставе: H. Popławska, *Szpada na wachlarzu*, Warszawa 1987.

Źródło 2. Храналагічная стужка




### Заданне 14. (0–1)

**Закончы сказ. З прапанаваных варыянтаў выберы адпаведны адказ .**

Размова герояў рамана датычыць падзей, што адбываліся ў часе, пазначаным на храналагічнай стужцы лічбаю

**A.** 1.
**B.** 2.
**C.** 3.
**D.** 4.

### Агульнае патрабаванне

I. Гістарычная храналогія.

4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

**Адмысловыя патрабаванні**
XIII. Рэч Паспалітая ў першай палове XVIII стагоддзя. Вучань:
1) называе прычыны і характарызуе праявы дзяржаўнага крызісу ў часы панавання саксонскай дынастыі.

**Прынцыпы ацэньвання**
1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

**Рашэнне**
C

**Заданне 15. (0–1)**
**Напішы, чый бок ў канфлікце паміж *каралём Станілавам* і *міласцівым Аўгустам* узялі героі прыведзенага фрагмент. Абгрунтуй адказ пры дапамозе інфармацыі з тэксту.**

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

**Агульнае патрабаванне**
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы;
3. Адрозненне ў гістарычным наратыве […] ацэначнага меркавання.

**Адмысловае патрабаванне**
XIII. Рэч Паспалітая ў першай палове XVIII стагоддзя. Вучань:
1) называе прычыны і характарызуе праявы дзяржаўнага крызісу ў часы панавання саксонскай дынастыі.

**Прынцыпы ацэньвання**
1 бал – правільнае ўказанне боку канфлікту і належнае абгрунтаванне.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

**Прыклады рашэння**
- Героі твора падтрымліваюць пазіцыю “караля Станіслава”, таму што лічаць яго “сваім” і добра пра яго выказваюцца.
- Героі падтрымліваюць пазіцыю Станіслава Ляшчынскага, таму што лічаць караля Аўгуста чужынцам, выказваюцца пра яго з трывогай.

## Заданне 16. (0–2)

Фрагменты дакументаў

**Тэкст A**

Мы, народ Злучаных Штатаў, прагнучы паляпшэння Саюза, умацавання справядлівасці, забеспячэння міру ў краіне і супольнай абароны, павышэння агульнага дабрабыту і ўтрымання для нас самых і нашых нашчадкаў дабрадзейства свабоды, уводзім і ўсталёўваем для Злучаных Штатаў Амерыкі гэтую канстытуцыю.

На падставе: www.libr.sejm.gov.pl

**Тэкст B**

Паводле імператарскага абвяшчэння, законы дзейнічаюць ва ўсёй французскай дзяржаве. Яны будуць выконвацца ў любой частцы дзяржавы ад моманту іх абвяшчэння. Закон дзейнічае толькі на будучыню, не дзейнічае на мінулае.

На падставе: *Wiek* […] *w źródłach. Wybór tekstów źródłowych z propozycjami metodycznymi dla nauczycieli historii, studentów i uczniów*, oprac. M. Sobańska-Bondaruk, B. Lenard, Warszawa 1998.

**Тэкст C**

Нацыянальная Асамблея прызнае і абвяшчае, з падтрымкай і пад эгідай Узвышняга, наступныя правы чалавека і грамадзяніна.

Артыкул I. Людзі нараджаюцца і застаюцца свабоднымі і раўнапраўнымі.

Артыкул II. Мэтай кожнай палітычнай арганізацыі з’яўляецца абарона натуральных і неад'емных правоў чалавека. Такімі правамі з’яўляюцца свабода, уласнасць, бяспека і супраціўленне прыгнёту.

На падставе: www.libr.sejm.gov.pl

**Тэкст D**

Лічым неабвержнай і відавочнай наступную ісціну: усе людзі створаныя роўнымі; Творца даў ім неад’емныя правы, з якіх на першае месца трэба паставіць права на жыццё, свабоду і пошукі шчасця. Сабраўшыся на ўсеагульны кангрэс, мы ад імя ўлады добрага народу гэтых калоній урачыста абвяшчаем, што гэты Аб’яднаныя калоніі з’яўляюцца і маюць права быць свабоднымі і незалежнымі дзяржавамі.

На падставе: *Wiek* […] *w źródłach. Wybór tekstów źródłowych z propozycjami metodycznymi dla nauczycieli historii, studentów i uczniów*, oprac. M. Sobańska-Bondaruk, B. Lenard, Warszawa 2001.

**Які з прыведзеных тэкстаў, пазначаных літарамі A–D, быў створаны раней за усе, а які – пазней за ўсе астатнія? У кожным радку выберы адпаведную літару.**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **16.1.** | Тэкст, які быў створаны храналагічна раней за усе астатнія. | **A** | **B** | **C** | **D** |
| **16.2.** | Тэкст, які быў створаны храналагічна пазней за ўсе астатнія. | **A** | **B** | **C** | **D** |

### Агульныя патрабаванні

I. Гістарычная храналогія.

4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

**Адмысловыя патрабаванні**

XIV. Узнікненне Злучаных Штатаў. Вучань:

1) абмяркоўвае прычыны […] амерыканскай вайны за незалежнасць.

XVIII. Напалеонаўская эпоха. Вучань:

1) характарызуе палітычныя змены і сацыяльна-эканамічныя перамены ў Еўропе ў часы Напалеона.

**Прынцыпы ацэньвання**

2 балы – два правільныя адказы.
1 бал – адзін правільны адказ.
0 балаў – няправільны адказ або брак адказу.

**Рашэнне**

16.1. D
16.2. B

**Карта да заданняў 17 і 18.**




На падставе: *Atlas historyczny świata*, Warszawa – Wrocław 1998.

## Заданне 17. (0–1)

**Закончы сказ. З прапанаваных варыянтаў выберы адпаведны адказ .**

На карце паказаны межы Еўропы

**A.** да падпісання Другога Торунскага міру.
**B.** у часы паўстання Багдана Хмяльніцкага.
**C.** пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай.
**D.** пасля заканчэння Венскага кангрэса.

### Агульныя патрабаванні

I. Гістарычная храналогія.
4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
2. Лакалізацыя ў прасторы гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў з выкарыстаннем картаў […] з рознымі маштабамі.

### Адмысловае патрабаванне

XVII. Барацьба за захаванне незалежнасці ў апошнія гады XVIII стагоддзя. Вучань:
1) размяшчае ў часе I […] падзел Рэчы Паспалітай […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Рашэнне

C

## Заданне 18. (0–1)

**Да назваў тэрыторый у табліцы дапасуй літары, якімі яны пазначаныя на карце. У кожным радку табліцы запішы адпаведную літару.**

| | | |
|---|---|---|
| **1.** | Асманская імперыя | |
| **2.** | Дзяржава Габсбургаў | |

### Агульныяе патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц (у тым ліку картаграфічных), спроба зрабіць на яе падставе высновы.
2. Лакалізацыя ў прасторы гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў з выкарыстаннем картаў […] з рознымі маштабамі.

## Адмысловыя патрабаванні

XVII. Барацьба за захаванне незалежнасці ў апошнія гады XVIII стагоддзя. Вучань:

1) размяшчае ў часе I […] падзел Рэчы Паспалітай і паказвае на карце тэрытарыяльныя змены […].

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае ўпісанне ўсіх літар.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Рашэнне

1. B
2. D

## Заданне 19. (0–1)

**Упарадкуй прыведзеныя ніжэй падзеі такім чынам, каб яны ўтварылі правільную прычынна-выніковую сувязь. Запішы літары ў клеткі ў адпаведным парадку.**

**A.** II падзел Рэчы Паспалітай
**B.** ухваленне *Канстытуцыі 3 мая*
**C.** стварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі
**D.** параза польскіх войскаў у вайне з мэтай абароны *Канстытуцыі 3 мая*
**E.** бітвы пад Зяленцамі і Дубенкай



## Агульнае патрабаванне

I. Гістарычная храналогія.

4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе, а таксама іх упарадкаванне і вызначэнне прычынна-выніковых сувязяў.

## Адмысловыя патрабаванні

XVI. Рэч Паспалітая ў станіслававоўскую эпоху. Вучань:

3) размяшчае ў часе […] ухваленне *Канстытуцыі 3 мая* […];

4) тлумачыць абставіны стварэння Таргавіцкай канфедэрацыі і прадстаўляе яе наступствы.

XVII. Барацьба за захаванне незалежнасці ў апошнія гады XVIII стагоддзя. Вучань:

1) размяшчае ў часе […] II […] падзел Рэчы Паспалітай […].

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае ўпісанне ўсіх літар.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Рашэнне

B, C, E, D, A

## Заданне 20. (0–1)

Крыніца 1. Фрагмент успамінаў удзельніка бітвы

Касцюшка выставіў свае войска ў баявым парадку на ўзвышшы насупраць маскоўскага лагера. Тады ж правая маскоўская калона з’явілася на левым крыле палякаў і пачала рыхтавацца. Калі тры атакі кавалерыі Мадалінскага былі адбітыя, Касцюшка на чале сялян, што напярэдадні прыбылі ў лагер, і аднаго батальёна рэгулярных войскаў рушыў супраць цэнтральнай калоны, якую, як толькі пачалася атака, атрымалася зламаць і разбіць. Палякі ўтрымалі поле бітвы і здабылі 12 гармат.

На падставе: *Wiek XVI–XVIII w źródłach. Wybór tekstów źródłowych z propozycjami metodycznymi dla nauczycieli historii i studentów,* oprac. M. Sobańska-Bondaruk, S.B. Lenard, Warszawa 1999.

Крыніца 2. Планы бітваў

**A**




**B**




На падставе: S. Kieniewicz, A, Zahorski, W. Zajewski, *Trzy powstania narodowe*, Warszawa 1994.

**Вырашы, на якім плане (A ці B) прадстаўлены ход апісанай у тэксце бітвы. Абгрунтуй адказ.**

………………………………………………………………………………………..………………

………………………………………………………………………………………..……………

### Агульныя патрабаванні

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц (у тым ліку картаграфічных), спроба зрабіць на яе падставе высновы.
2. Лакалізацыя ў прасторы гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў з выкарыстаннем […] планаў з рознымі маштабамі.

### Адмысловыя патрабаванні

XVII. Барацьба за захаванне незалежнасці ў апошнія гады XVIII стагоддзя. Вучань:

2) прадстаўляе […] наступствы паўстання Касцюшкі.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Прыклады рашэння

- Ход бітвы прадстаўлены на плане A, бо на ім паказана, што Мадалінскі адступіў, а Касцюшка прарваў лінію расійскіх войскаў – менавіта пра гэта апавядаецца ў тэксце.
- Ход бітвы прадстаўлены на плане A, таму што на плане B паказана бітва, якую польскія войскі прайгралі.

## Тэкст і карты да заданняў 21 і 22.

Крыніца 1. Фрагмент трактату
Артыкул 5.
Правінцыямі, якія да 1 студзеня 1772 г. з’яўляліся часткай былога Польскага Каралеўства і якія пазней у розныя часы трапілі пад прускую ўладу, будзе валодаць саксонскі кароль на падставе права ўласнасці і сюзэрэнітэту.

На падставе: *Wiek XIX w źródłach. Wybór tekstów źródłowych z propozycjami metodycznymi dla nauczycieli historii, studentów i uczniów*, oprac. M. Sobańska-Bondaruk, B. Lenard, Warszawa 1998.

Крыніца 2. Карты

**A**




**B**




На падставе: *Szkolny atlas historyczny*, Warszawa 2013.

**Заданне 21. (0–1)**

**Вырашы, на якой карце (A ці B) прадстаўлена тэрыторыя дзяржавы, што ўзнікла на падставе рашэнняў, згаданых у тэксце трактату. Абгрунтуй адказ.**

……………………………………………………………………………………..………………

……………………………………………………………………………………..……………

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц (у тым ліку картаграфічных), спроба зрабіць на яе падставе высновы.
2. Лакалізацыя ў прасторы гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў з выкарыстаннем карт […] з рознымі маштабамі.

### Адмысловае патрабаванне

XVIII. Напалеонаўская эпоха. Вучань:

3) апісвае ўзнікненне Герцагства Варшаўскага, яго […] тэрыторыю.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.

0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Прыклады рашэння

- На карце A, таму што на ёй паказаныя межы Герцагства Варшаўскага, якое было створана з земляў, якія Напалеон адабраў у Прусіі.
- На карце A, таму што гэта Герцагства Варшаўскае, створанае з адабраных у Прусіі земляў пад уладай караля Саксоніі ў выніку Тыльзіцкага міру.
- На карце A, таму што на карце B паказанае Царства Польскае пад уладай цара Расіі, створанае з земляў, першапачаткова занятых Прусіяй і Аўстрыяй.

## Заданне 22. (0–1)

**Дапоўні сказ.**

Цытаваны фрагмент паходзіць з мірнага трактата, які быў заключаны паміж двума манархамі – ……………..……………….. і ……………..……………… .

### Агульныя патрабаванні

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловыя патрабаванні

XVIII. Напалеонаўская эпоха. Вучань:

3) апісвае ўзнікненне Герцагства Варшаўскага […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае дапаўненне дзвух пропускаў.
0 балаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне

Расіі, Францыі

## Заданне 23. (0–1)

Г. Сянкевіч, *Ліхтаршчык на маяку* (фрагмент)

Заставалася яго праэкзаменаваць, таму і пачалася наступная размова:

– Вы адкуль?

– Я паляк. […]

– Вы калісьці служылі? Ці ёсць у Вас доказы сумленнай дзяржаўнай службы?

Стары дастаў з-за пазухі выцвілы кавалак ядвабнай тканіны, падобны да шматка старой харугвы. Разгарнуўшы яго, ён прамовіў:

– Вось яны, доказы. Гэты крыж […] я атрымаў у Венгрыі. Потым змагаўся ў Штатах супраць паўднёўцаў, але там не даюць крыжоў – так што вось дакумент.

Фалканбрыдж узяў дакумент і пачаў чытаць.

– Хм! Скавінскі? Гэта Вашае прозвішча?.. Хм!… Дзве харугвы, здабытыя ўласнаручна ў штыхавой атацы… Вы былі мужным жаўнерам!

H. Sienkiewicz, *Latarnik*, Warszawa 2017.

**Назаві два ваенныя канфлікты, што ўзгадваюцца ў тэксце і ў якіх удзельнічаў Скавінскі.**

…………………………………………………………………………………………..………………

### Агульнае патрабаванне
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловыя патрабаванні
XXI. Еўропа ў часы “Вясны народаў”. Вучань:
1) пералічвае падзеі, звязаныя са змаганнем з венскай сістэмай, характарызуе ход “Вясны народаў” у Еўропе.

XXIII. Еўропа і свет у 2-й палове XIX і на пачатку XX стагоддзя. Вучань:
2) прадстаўляе прычыны і наступствы Грамадзянскай вайны ў Злучаных Штатах.

### Прынцыпы ацэньвання
1 бал – правільнае напісанне назваў падзей.
0 балаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне
“Вясны народаў” у Венгрыі, Грамадзянская вайна ў Злучаных Штатах Амерыкі

## Заданне 24. (0–1)

Фрагменты тэкстаў з крыніц

**Тэкст A**
Усё было кепска – і агульны план паўстання ў Варшаве, і яго недарэчнае выкананне. Складаны план па раззбраенні пяці расійскіх палкоў мог атрымацца толькі тады, калі б польскія генералы далучыліся да змовы і калі б загады паўстанцам прыходзілі б зверху. Але ў змове не ўдзельнічаў аніводзін афіцэр вышэйшага рангу. І гэтая атака на казармы ў Лазенках – якая ж нягеглая! Толькі небяспечны Канстанцін, перапалохаўшыся, уцёк са свайго Бельведэрскага палаца.

На падставе: G. Chomicki, L. Śliwa, […] *Teksty źródłowe. Tematy lekcji i zagadnienia do historii w szkole średniej*, Kraków 2001.

**Тэкст B**
У 17:00 полк “Гарлух” меўся нечакана заатакаваць нямецкія пазіцыі вакол Акенця. У 16:00, улічваючы кепскае ўзбраенне сваіх салдат і тое, што атрымалася сабраць не больш за 60-70% складу атрадаў, а таксама ўлічваючы тое, што большасць салдат павінна наступаць на ўзброенага праціўніка па адкрытай мясцовасці, маёр Высоцкі сваім загадам адмяняе наступленне.

На падставе: R. Wiśniewski, *Palimpsest* […], www.wolnelektury.pl

**Вырашы, які тэкст (A ці B) тычыцца Лістападаўскага паўстання. Абгрунтуй адказ, спасылаючыся на абодва тэксты.**

……………………………………………………………………………………………..………………

……………………………………………………………………………………………..……………

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловыя патрабаванні

XX. Польскія землі ў 1815–1848 гадах. Вучань:

3) прадстаўляе прычыны выбуху Лістападаўскага паўстання […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.

0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Прыклады рашэння

- Тэкст A, таму што падчас Лістападаўскага паўстання ў Варшаве знаходзіліся расійскія войскі, а ў другім тэксце гаворка пра барацьбу з немцамі.
- Тэкст A тычыцца Лістападаўскага паўстання, таму што ў ім распавядаецца пра барацьбу з расійскімі войскамі, а ў тэксце B гаворыцца пра нямецкія войскі, якія не бралі ўдзелу ў Лістападаўскім паўстанні.

## Заданне 25. (0–4)

Паштоўка




N. Davies, *Od i do. Najnowsze dzieje Polski według historii pocztowej*, t. 1, Warszawa 2008.

**25.1. Назавіце дзве падзеі з гісторыі Польшчы XIX стагоддзя, якія звязаныя з паштоўкай на ілюстрацыі.**

…………………………………………………………………………………………………………...

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловыя патрабаванні

XX. Польскія землі ў 1815–1848 гадах. Вучань:

3) прадстаўляе прычыны выбуху Лістападаўскага паўстання […].

XXII. Студзеньскае паўстанне. Вучань:

2) характарызуе дзеянні паўстанцаў […].

**Прынцыпы ацэньвання**

1 бал – напісанне назваў дзвух падзеі.

0 балаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

**Рашэнне**

лістападаўскае паўстанне, студзеньскае паўстанне

**25.2. Патлумач, якое значэнне мае паштоўка.**

…………………………………………………………………………………………..………………

…………………………………………………………………………………………..……………

**Агульнае патрабаванне**

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

**Адмысловыя патрабаванні**

XX. Польскія землі ў 1815–1848 гадах. Вучань:

3) прадстаўляе прычыны выбуху Лістападаўскага паўстання […].

XXII. Студзеньскае паўстанне. Вучань:

2) характарызуе дзеянні паўстанцаў[…].

**Прынцыпы ацэньвання**

1 бал – тлумачэнне сэнсу паштоўкі.

0 балаў – няправільны адказ або брак адказу.

**Прыклады рашэння**

- Заклік змагацца за незалежную Польшчу.
- Напамін пра незалежніцкую дзейнасць жыхароў польскіх земляў у XIX стагоддзі.
- Прапагаванне супольнасці трох народаў – насельнікаў земляў былой Рэчы Паспалітай.

**25.3. Выберы два графічныя элементы паштоўкі (акрамя дат) і патлумач іх сімволіку.**

…………………………………………………………………………………………..………………

…………………………………………………………………………………………..……………

**Агульнае патрабаванне**

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

## Адмысловыя патрабаванні

XX. Польскія землі ў 1815–1848 гадах. Вучань:

3) прадстаўляе прычыны выбуху Лістападаўскага паўстання […].

XXII. Студзеньскае паўстанне. Вучань:

2) характарызуе дзеянні паўстанцаў […].

## Прынцыпы ацэньвання

2 балы – адзначэнне двух графічных элементаў і тлумачэнне сімволікі кожнага з іх.
1 бал – адзначэнне аднаго графічнага элемента і тлумачэнне яго сімволікі.
0 балаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Прыклады рашэння

трохпольны гербавы шчыт – дзяржава, якая складаецца з трох народаў, супольнасць народаў
карона – суверэнітэт дзяржавы
Пагоня – літоўскі народ
белы арол – польскі народ
Міхаіл Архістратыг – рускі народ

## Тэкст і ілюстрацыі да заданняў 26 і 27.

Крыніца 1. Фрагмент працы

Пасля 1864 года расійскія ўлады пачалі прасоўваць будаўнічыя праекты, базаваныя на візантыйскай і старажытнарускай традыцыях. „Рускі нацыянальны стыль" стаў у тыя часы інструментам інтэграцыі Прывіслінскага краю з Расіяй. У Варшаве ў 1894-1912 гадах ў самым цэнтры горада быў узведзены манументальны сабор св. Аляксандра Неўскага. Гэта было зроблена, каб прадэманстраваць магутнасць расійскай улады і прынізіць польскія патрыятычныя пачуцці. Адна з капліц была прысвечана расіянам, якія задушылі *польскі бунт* 1863-1864 гадоў. Князь Аляксандр Неўскі, які жыў у XIII стагоддзі і ў гонар якога быў асвечаны сабор, сімвалізаваў трыумф Расіі над яе ворагам.

На падставе: A. Szwarc, *Architektura i polityka* […], „Mówią Wieki" nr 5/2011.

Крыніца 2. Ілюстрацыі

A



B



www.starawarszawa.pl; www.williams.edu

**Заданне 26. (0–1)**

**Вырашы, на якой ілюстрацыі (A ці B) прадстаўлены будынак, апісаны ў тэксце. Напішы адну з адметнасцяў будынку, што сведчыць пра гэта.**

……………………………………………………………………………………..………………

……………………………………………………………………………………..……………

## Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

## Адмысловае патрабаванне

XXII. Студзеньскае паўстанне. Вучань:

4) характарызуе формы рэпрэсій пасля паўстання.

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне і напісанне адной з адметнасцяў будынка.

0 балаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Прыклады рашэння

- Згаданы ў тэксце будынак прадстаўлены на ілюстрацыі В, таму што яго выгляд нагадвае візантыйскую/праваслаўную архітэктуру.
- Гэта будынак прадстаўлены на ілюстрацыі В, таму што на яго цыбулепадобных купалах усталяваныя праваслаўныя крыжы.

## Заданне 27. (0–1)

**Ацані праўдзівасць дадзеных сказаў. Выберы П, калі змест сказу адпавядае праўдзе, або Н – калі не адпавядае.**

| | | |
|---|---|---|
| З тэксту вынікае, што апісаны ў тэксце будынак быў элементам палітыкі русіфікацыі польскіх земляў. | **П** | **Н** |
| Згаданы ў тэксце *польскі бунт* – студзеньскае паўстанне. | **П** | **Н** |

### Агульнае патрабаванне

I. Гістарычная храналогія.

4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

XXII. Студзеньскае паўстанне. Вучань:

4) характарызуе формы рэпрэсій пасля паўстання.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Рашэнне

ПП

## Заданне 28. (0–1)

Крыніца 1. Фрагмент працы

Плынь гэтая імкнецца стварыць новыя стылёвыя формы, якія супрацьпастаўляюцца гістарызму і акадэмізму. Архітэктары распрацоўвалі формы, арнаментацыю і дэкор, арыентуючыся на паўстанне візуальных уражанняў, што выклікаюць вялікую эмацыйную рэакцыю. Выкарыстаныя ў дэкоры арнаменты неспакойныя, дынамічныя і лінеарныя. Побач з геаметрычнымі арнаментамі выкарыстана шмат стылізаваных жывёльных і раслінных элементаў. Найвялікшага росквіту апісаная плынь дасягнула ў 1898-1901 гадах.

На падставе: E. Charytonow, *Zarys historii architektury*, Warszawa 1983.

Крыніца 2. Ілюстрацыі

1



2



3



4



www.lublin.fotopolska.eu; www.historiasztuki.com; www.propertydesign.pl

**Закончы сказ. З прапанаваных варыянтаў выберы адпаведны адказ.**

У вышэйапісаным стылі выкананаы элемент, прадстаўлены на ілюстрацыі пад нумарам

**A.** 1.
**B.** 2.
**C.** 3.
**D.** 4.

## Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

## Адмысловае патрабаванне

XXIII. Еўропа і свет у II палове XIX і на пачатку XX стагоддзя. Вучань:

4) пералічвае новыя […] культурныя з'явы […].

### Прынцыпы ацэньвання
1 бал – правільны адказ.
0 балаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Рашэнне
B

### Заданне 29. (0–2)

Плакат




www.signs.pl

**29.1. Назаві гістарычнае здарэнне, якое звязана з плакатам.**

…………………………………………………………………………………..………………

### Агульнае патрабаванне
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне
XXVIII. Аднаўленне польскай дзяржавы пасля Першай сусветнай вайны. Вучань:
2) прадстаўляе працэс стварэння межаў: версальскія рашэнні […].

### Прынцыпы ацэньвання
1 бал – напісанне назвы падзеі.
0 балаўаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

### Прыкладнае рашэнне
плебісцыт у Верхняй Сілезіі, плебісцыт 1921 года

**29.2. Патлумач мэту стварэння плаката.**

……………………………………………………………………………………….………………

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

XXVIII. Аднаўленне польскай дзяржавы пасля Першай сусветнай вайны. Вучань:
2) прадстаўляе працэс стварэння межаў: версальскія рашэнні […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – тлумачэнне мэты стварэння плакату.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Прыкладнае рашэнне

Заахвочванне да галасавання за прыналежнасць Сілезіі да Польшчы.

## Заданне 30. (0–1)

Крыніца 1. Сакавіцкая канстытуцыя (фрагмент)

Артыкул 2.
Народнымі органамі ў сферы заканадаўства з’яўляюцца Сейм і Сенат, у сферы выканаўчай улады – Прэзідэнт Польскай рэспублікі разам з адказнымі міністрамі, у юрыдычнай сферы – незалежныя Суды.
Артыкул 39.
Прэзідэнта Польскай рэспублікі на сем гадоў выбірае Сейм і Сенат.
Артыкул 44.
Пад кожным урадавым актам Прэзідэнта Польскай рэспублікі для набыцця юрыдычнай сілы патрэбны подпіс Старшыні Рады Міністраў.
Артыкул 51.
За свае афіцыйныя дзеянні Прэзідэнт Польскай рэспублікі не нясе ні парламентскай, ні грамадзянскай адказнасці.

На падставе: www.libr.sejm.gov.pl

Крыніца 2. Красавіцкая канстытуцыя (фрагмент)

Арт. 2. (1) На чале дзяржавы знаходзіцца Прэзідэнт Польскай рэспублікі.
(2) Ён перад Богам і гісторыяй адказвае за лёс дзяржавы.
(4) У яго асобе ўвасоблена суцэльная і непадзельная дзяржаўная ўлада .
Арт. 3. (1) Органамі дзяржавы, якія застаюцца пад вяршэнствам Прэзідэнта Польскай рэспублікі, з’яўляюцца Урад, Сейм, Сенат, Узброеныя Сілы, Суды, Дзяржаўны кантроль.

На падставе: www.libr.sejm.gov.pl

**Параўнай сакавіцкую і красавіцкую канстытуцыі з пункту гледжання паўнамоцтваў прэзідэнта Польскай рэспублікі. На падставе цытат адзнач адно адрозненне.**

…………………………………………………………………………………..………………

…………………………………………………………………………………..……………

…………………………………………………………………………………..………………

…………………………………………………………………………………..……………

…………………………………………………………………………………..………………

…………………………………………………………………………………..……………

## Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

III. Стварэнне гістарычнага наратыву.

3. Прадстаўленне аргументаў для абгрунтавання ўласнага меркавання пра гістарычыя працэсы […].

## Адмысловае патрабаванне

XXIX. Польская Рэспубліка ў 1921–1939 гадах. Вучань:

2) характарызуе палітычную сістэму Польшчы на падставе сакавіцкай канстытуцыі 1921 г.;

4) апісвае польскі аўтарытарызм – […] сістэмныя змены (красавіцкая канстытуцыя 1935 г.).

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае паданне розніцы.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

## Прыклады рашэння

- У сакавіцкай канстытуцыі запісана, што прэзідэнт ПР з’яўляецца толькі выканаўчай уладаю, якую выконвае разам з міністрамі, а кожны яго акт патрабуе контрасігнацыі старшыні Рады міністраў. У сваю чаргу, паводле красавіцкай канстытуцыі, прэзідэнт з’яўляецца кіраўнікам урада, заканадаўчай улады (Сейма і Сената) і судовай улады (судоў).
- У сакавіцкай канстытуцыі запісана, што улада прэзідэнта ПР істотна абмежаваная іншымі органамі ўлады. У сваю чаргу, паводле красавіцкай канстытуцыі, улада прэзідэнта была абмежаваная толькі Богам і гісторыяй.

## Заданне 31. (0–1)

Карта




- раёны, анексаваныя Германіяй
- раёны, акупаваныя Германіяй
- раёны, анексаваныя Венгрыяй

**1** Пратэктарат Чэхіі і Маравіі
**L** Люксембург
**G** Свабодны горад Гданьск

На падставе: *Szkolny atlas historyczny*, Warszawa 2013.

**Вырашы, ці на карце прадстаўлены межы ў красавіку 1939 года. Абгрунтуй адказ.**

…………………………………………………………………………………………..………………

…………………………………………………………………………………………..……………

### Агульныя патрабаванні

I. Гістарычная храналогія.

4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц (у тым ліку картаграфічных), спроба зрабіць на яе падставе высновы.
2. Лакалізацыя ў прасторы гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў з выкарыстаннем карт […] з рознымі маштабамі.

## Адмысловае патрабаванне

XXXI. Шлях да вайны. Вучань:
3) апісвае палітыку гітлераўскай Германіі – разбурэнне версальска-лакарнскай сістэмы: ад рэмілітарызацыі Рэйнланда да Мюнхенскага пагаднення.

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.
0 балаў – няправільны ці няпоўны адказ або брак адказу.

## Прыклады рашэння

- На карце прадстаўлены межы Еўропы ў красавіку 1939 года, таму што Аўстрыя і частка Чэхаславакіі ўжо захопленыя Германіяй, а з рэшты Чэхаславакіі ўтварылі славацкую дзяржаву.
- Прадстаўлены межы ў красавіку 1939 года, таму што на тэрыторыі Чэхаславакіі ўжо існуюць асобныя дзяржавы: Пратэктарат Чэхіі і Маравіі ды Славакія.
- На карце прадстаўлены межы ў 1939 годзе, таму што Польская рэспубліка мяжуе з Венгрыяй.

## Заданне 32. (0–4)

Малюнак




Пераклад надпісаў: *German boundary* – нямецкая мяжа; *Russian boundary* – расійская мяжа; *nazism* – нацызм; *communism* – камунізм; *the Pole* – паляк.

www.rubylane.com

**32.1. Напішы назву падзеі, адлюстраваную на малюнку.**

…………………………………………………………………………………..………………

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

XXXI. Шлях да вайны. Вучань:

5) пералічвае наступствы пакту Молатава-Рыбентропа.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – напісанне назвы падзеі.

0 балаў – няправільны адказ або брак адказу.

**Прыклады рашэння**
- заключэнне пакту Молатава-Рыбентропа/ заключэнне нямецка-савецкага пакта 1939 года
- нямецка-савецкая агрэсія на Польшчу ў верасні 1939 года
- вераснёўская кампанія
- пачатак Другой сусветнай вайны

**32.2. Патлумач значэнне малюнка.**

……………………………………………………………………………………..………………

**Агульнае патрабаванне**
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

**Адмысловае патрабаванне**
XXXI. Шлях да вайны. Вучань:
5) пералічвае наступствы пакту Молатава-Рыбентропа.

**Прынцыпы ацэньвання**
1 бал – фармулёўка ідэі малюнка.
0 балаў – няправільны адказ або брак адказу.

**Прыклады рашэння**
- Палякі пад пагрозай з двух бакоў.
- Германія і Расія займаюць тэрыторыі, дзе жывуць палякі.
- На Польшчу напалі, і яна бездапаможная ў выніку атакі двух дыктатараў – Гітлера і Сталіна.
- Савецка-нямецкае супрацоўніцтва перад пачаткам Другой сусветнай вайны.

**32.3. Выберы два графічныя элементы малюнка і патлумач іх сімволіку.**

……………………………………………………………………………………..………………

……………………………………………………………………………………..……………

**Агульнае патрабаванне**
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

**Адмысловае патрабаванне**
XXXI. Шлях да вайны. Вучань:
5) пералічвае наступствы пакту Молатава-Рыбентропа.

## Прынцыпы ацэньвання

2 балы – указанне двух графічных элементаў і тлумачэнне сімволікі кожнага з іх.
1 балаў – указанне аднаго графічнага элементу і тлумачэнне яго сімволікі.
0 балаў – няправільны ці няпоўны адказ або брак адказу.

## Прыклады рашэння

- калючы дрот – мяжа паміж дзяржавамі/няволя/дыктатура/тэрор
- мужчына з надпісам „nazizm” – Гітлер/Трэці Рэйх
- мужчына з надпісам „communism” – Сталін/СССР
- мужчына з надпісам „the Pole” – паляк/нечаканасць, пачуццё бездапаможнасці ў выніку нечаканага нападу

## Карта і табліца да заданняў 33 і 34.

Крыніца 1. Перамяшчэнні польскага і нямецкага насельніцтва ў 1945–1949 гадах




тэрыторыя Польшчы пасля 1945 года — мяжа Польскай рэспублікі

Палякі — немцы

На падставе: *Szkolny atlas historyczny*, Warszawa 2013.

Крыніца 2. Колькасць насельніцтва польскай і нямецкай нацыянальнасці, што пражывалі на тэрыторыі Польшчы

| Год / Нацыянальнасць | 1931 | сярэдзіна 1945 | канец 1949 |
|---|---|---|---|
| палякі | 20 644 000 | 18 930 000 | 23 940 000 |
| немцы | 780 000 | 3 700 000 | 200 000 |

На падставе: *Szkolny atlas historyczny*, Warszawa 2013.

## Zadanie 33. (0–1)

**Закончы сказ. З прапанаваных варыянтаў выберы адпаведны адказ.**

Пра прадстаўленыя на карце змены межаў Польшчы дамовіліся кіраўнікі антыгітлераўкай кааліцыі на канферэнцыі ў

**A.** Мюнхене.
**B.** Версалі.
**C.** Лакарна.
**D.** Ялце.

### Агульнае патрабаванне

I. Гістарычная храналогія.
4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц (у тым ліку картаграфічных), спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

XXXIII. Другая сусветная вайна і яе этапы. Вучань:
4) пералічвае асноўныя рашэнні канферэнцыі Вялікай тройкі ([…] Ялта […]).

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Рашэнне

D

## Заданне 34. (0–2)

**Патлумач прычыны зменаў колькасці нямецкай насельніцтва на тэрыторыі Польшчы паміж 1931 і 1945, а таксама паміж 1945 і 1949 гадамі.**

**1.** Змены паміж 1931 і 1945 гадамі: ...................................................................

.............................................................................................................

**2.** Змены паміж 1945 і 1949 гадамі: ...................................................................

.............................................................................................................

### Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц (у тым ліку картаграфічных), спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

XXXVI. Свет пасля Другой сусветнай вайны. Вучань:

1) характарызуе непасрэдныя вынікі Другой сусветнай вайны, падкрэсліваючы сацыяльныя […] наступствы […].

### Прынцыпы ацэньвання

2 балы – правільны адказ з улікам дзвюх зменаў у абодвух перыядах.
1 бал – правільны адказ з улікам аднаго з прадстаўленых перыядаў.
0 балаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Прыклады рашэння

1. далучэнне да Польшчы усходніх земляў Германіі
2. высяленне нямецкага насельніцтва ў Германію

## Заданне 35. (0–1)

Фотаздымак



www.se.pl

**Закончы сказ. З прапанаваных варыянтаў выберы адпаведны адказ .**

Фотаздымак быў зроблены ў Варшаве ў

**A.** трыццатыя гады XX стагоддзя.
**B.** пяцідзесятыя гады XX стагоддзя.
**C.** сямідзесятыя гады XX стагоддзя.
**D.** дзевяностыя гады XX стагоддзя.

### Агульныя патрабаванні

I. Гістарычная храналогія.
   4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
   1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

### Адмысловае патрабаванне

XXXVIII. Сталінізм у Польшчы і яго наступствы. Вучань:
   1) прадстаўляе сацыяльна-эканамічныя і культурныя перамены […] часоў сталінізму.

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільны адказ.
0 балаў – няправільны адказ або брак адказу.

### Рашэнне

B

## Заданне 36. (0–1)

Крыніца 1. Фрагмент комікса




На падставе: *Solidarność – 25 lat. Nadzieja zwykłych ludzi*, Warszawa 2005.

Крыніца 2. Храналагічная стужка



**Закончы сказ. З прапанаваных варыянтаў выберы адпаведны адказ .**

Падзеі, прадстаўленыя на ілюстрацыі, мелі месца ў перыяд, пазначаны на храналагічнай стужцы нумарам

**A.** 1.
**B.** 2.
**C.** 3.
**D.** 4.

## Агульныя патрабаванні
I. Гістарычная храналогія.
4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].
II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

## Адмысловае патрабаванне
XXXIX. Польшча ў 1957–1981 гадах. Вучань:
7) тлумачыць прычыны і наступствы жнівеньскіх забастовак 1980 года.

## Прынцыпы ацэньвання
1 бал – правільны адказ.
0 балаўаў – няправільны адказ або брак адказу.

## Рашэнне
C

## Заданне 37. (0–1)

Крыніца 1. Фрагмент першай старонкі газеты


Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!

Trybuna Ludu

ORGAN KOMITETU CENTRALNEGO POLSKIEJ ZJEDNOCZONEJ PARTII ROBOTNICZEJ

WOJCIECH JARUZELSKI: Zwracam się do wszystkich obywateli – nadeszła godzina ciężkiej próby. Próbie tej musimy sprostać, dowieść, że Polski jesteśmy warci!

Ukonstytuowała się Wojskowa Rada Ocalenia Narodowego

Крыніца 2. Лістоўка



www.pamięć.pl

**Вырашы, ці абедзве крыніцы датычаць той жа самай падзеі. Абгрунтуй адказ, спасылаючыся на змест крыніц.**

……………………………………………………………………………………………..………………

……………………………………………………………………………………………..……………

## Агульнае патрабаванне

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

## Адмысловае патрабаванне

XL. Дзесяцігоддзе 1981–1989. Вучань:

1) патлумач прычыны ўвядзення ваеннага становішча […].

## Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільнае вырашэнне разам з абгрунтаваннем.

0 балаў – няправільны або няпоўны адказ ці брак адказу.

## Прыклады рашэння

- Абедзве крыніцы адсылаюць да адной і той жа падзеі, таму што на лістоўцы намаляваны танк, які наязджае на знак “Салідарнасці” – гэта сімвал увядзення танкаў на вуліцы падчас рэжыму ваеннага становішча. У сваю чаргу, газета інфармуе пра выступленне генерала Ярузельскага і стварэнне Ваеннага савета нацыянальнага выратавання (WRON) ды пра ўвядзенне Дзяржаўным саветам ваеннага становішча.
- Абедзве крыніцы датычаць (увядзення) ваеннага становішча. Другая спасылаецца на выкарыстанне войскаў супраць “Салідарнасці”, у тым ліку танкаў, першая – на прамову генерала Ярузельскага, у якой ён абвясціў увядзенне ваеннага становішча.

## Заданне 38. (0–1)

**Сярод ніжэйпададзеных падзей, пазначаных літарамі А – D, выберы першую і апошнюю падзею паводзе храналогіі. У кожным радку табліцы напішы адпаведную літару.**

| | | |
|---|---|---|
| **1.** | Першая па храналогіі падзея | |
| **2.** | Апошняя па храналогіі падзея | |

**А.** Падзенне Берлінскай сцяны.
**B.** Стварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.
**C.** Стварэнне Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавора.
**D.** Распад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

### Агульнае патрабаванне

I. Гістарычная храналогія.
4. Размяшчэнне гістарычных працэсаў, з'яў і фактаў у часе […].

### Адмысловыя патрабаванні

XXXVI. Свет пасля Другой сусветнай вайны. Вучань:
1) характарызуе непасрэдныя вынікі Другой сусветнай вайны […] з улікам узнікнення Арганізацыі Аб'яднаных Нацый;
10) тлумачыць прычыны ды лакалізуе ў часе і прасторы працэс распаду СССР на мяжы 1980 – 1990-х гадоў […].

### Прынцыпы ацэньвання

1 бал – правільна запісаныя ўсе літары.
0 балаўаў – няправільны ці няпоўны адказ або брак адказу.

### Рашэнне

1. B
2. D

## Заданні з аргументаваннем

У заданнях гэтага тыпу вучню давядзецца заняць пазіцыю адносна розных меркаванняў на тэму працэсаў, падзей ці гістарычных постацяў, а таксама абгрунтаваць свой выбар двума істотнымі і лагічнымі аргументамі з выкарыстаннем канкрэтных гістарычных ведаў. Прадметам ацэнкі будзе не зроблены вучнем выбар, а яго здольнасць аргументаваць. Вучань павінен будзе выразна зазначыць сваю пазіцыю (напрыклад “На маю думку, прыведзенае меркаванне правільнае”; “Я не згодны з прыведзеным меркаваннем”, “Я толькі часткова згодны з прыведзеным меркаваннем”) і прывесці два аргументы.

Балы будуць прызначацца за:

- прывядзенне аргументаў, адпаведных па сутнасці і логіцы занятай пазіцыі (адпаведна – два аргументы „за” або два аргументы „супраць” ці адзін аргумент „за” і адзін „супраць”)
- пацвярджэнне аргументаў канкрэтнымі гістарычнымі ведамі разам з прывядзеннем канкрэтных прыкладаў (напрыклад, фактаў, тэрмінаў, постацяў).

### Заданне 39. (0–3)

**Ці можна згадзіцца з меркаваннем, што выбарнасць каралёў Рэчы Паспалітай у форме свабоднай элекцыі была карыснаю для дзяржавы? Напішы сваё меркаванне і прывядзі два аргументы, абапіраючыся на канкрэтныя гістарычныя веды.**

………………………………………………………………………………………..………………

………………………………………………………………………………………..………………

………………………………………………………………………………………..………………

………………………………………………………………………………………..………………

………………………………………………………………………………………..………………

………………………………………………………………………………………..………………

### Агульныя патрабаванні

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.

4. Тлумачэнне прычынна-выніковых сувязяў, аналіз з’яў і гістарычных працэсаў.

III. Стварэнне гістарычнага наратыву.

1. Канструяванне закончанай думкі з выкарыстаннем ведаў з адмысловых крыніц.

3. Прадстаўленне аргументаў на карысць уласнай пазіцыі наконт гістарычных працэсаў […].

### Адмысловае патрабаванне

X. Пачатковы этап гісторыі Рэчы Паспалітай. Вучань:

2) […] прадстаўлае прынцыпы свабоднай элекцыі; абмяркоўвае […] вынікі першых свабодных элекцый.

## Прынцыпы ацэньвання

3 балы – прадстаўленне думкі, падмацаванай двума аргументамі, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

2 балы – прадстаўленне думкі, падмацаванай двума аргументамі, з якіх толькі адзін абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

1 бал – прадстаўленне думкі, падмацаванай толькі адным аргументам, які абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

0 балаў – адсутнасць пазіцыі ці няправільны адказ або брак адказу.

## Прыклады ацэненых рашэнняў

Прыклад 1.

Я згодны з меркаваннем, што выбар каралёў у форме свабоднай элекцыі быў добры для дзяржавы. Я так лічу, бо Рэч Паспалітая была адзінай у Еўропе дзяржавай, у якой значная частка жыхароў (уся шляхта) мела уплыў на выбар свайго манарха. У першай свабоднай элекцыі ўзялі ўдзел дзясяткі тысяч прадстаўнікоў шляхты з усёй Рэчы Паспалітай. Акрамя таго, дзякуючы свабоднай элекцыі шляхта мела ўплыў на кіраванне дзяржавай: каб быць выбраным, кароль мусіў прысягнуць на “Генрыхавыя артыкулы” – законы дзяржаўнага ладу. Кароль павінен быў іх выконваць, інакш шляхта магла адмовіцца ад падпарадкавання. Такая дзяржава называецца шляхецкай дэмакратыяй.

3 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „за” і два аргументы, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

Прыняцце пазіцыі: *Я згодны з меркаваннем, што выбар каралёў у форме свабоднай элекцыі быў добры для дзяржавы.*

Аргумент 1: […] *дзякуючы гэтаму закону, уся шляхта мела ўплыў на выбар караля.*
Выкарыстане гістарычных ведаў: […] *шляхта складала значную частку жыхароў Рэчы Паспалітай, у першай свабоднай элекцыі прымалі ўдзел дзясяткі тысяч прадстаўнікоў шляхты з усёй Рэчы Паспалітай.*

Аргумент 2: *Дзякуючы свабоднай элекцыі, шляхта мела ўплыў на кіраванне дзяржавай.*
Выкарыстане гістарычных ведаў: *Кароль мусіў прысягнуць на “Генрыхавыя артыкулы” – законы дзяржаўнага ладу; шляхта магла яму не падпарадкавацца.*

Прыклад 2.

Я не згодны з пададзеным меркаваннем, таму што выбар караля ў форме свабоднай элекцыі быў некарысты для дзяржавы. Па-першае, каб быць абраным, уладар быў вымушаны саступіць шляхце і падпісаць “Генрыхавыя артыкулы”, якія вельмі аслаблялі яго ўладу. Шляхта магла яму не падпарадкавацца, напрыклад, арганізоўвала паўстанні супраць Жыгімонта III і Яна Казіміра. Па-другое, падчас свабоднай элекцыі існавала рызыка ўздзеяння на шляхту іншых дзяржаў: маглі мець месца подкупы, а выбары адбываліся пад пагрозаю расійскіх або шведскіх войскаў.

| |
|---|
| 3 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „супраць” і два аргументы, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.<br>Прыняцце пазіцыі: *Я не згодны з пададзеным меркаваннем, таму што выбар караля ў форме свабоднай элекцыі быў вельмі некарысны для дзяржавы.*<br><br>Аргумент 1: *Уладар быў змушаны саступаць шляхце.*<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: *Манарх быў вымушаны падпісваць “Генрыхавыя артыкулы”, якія вельмі аслаблялі яго ўладу. Шляхта магла яму не падпарадкавацца, напрыклад, арганізоўвала паўстанні супраць Жыгімонта III і Яна Казіміра.*<br><br>Аргумент 2: […] *падчас свабоднай элекцыі шляхта падпадала пад уздзеянне іншых дзяржаў.*<br>Выкарыстанне гістарычных ведаў: […] *шляхту маглі падкупіць, а элекцыі адбываліся пад пагрозаю расійскіх або шведскіх войскаў.* |

Прыклад 3.
Толькі часткова згодны з прыведзеным меркаваннем. Мяркую, што выбар караля ў форме свабоднай элекцыі меў свае плюсы і мінусы. Плюсам свабоднай элекцыі з’яўлялася ўзмацаванне ўплыву падданых на ўладу. Дзякуючы свабодным элекцыям шляхта магла кантраляваць манарха і ў выпадку неэфектыўнага кіравання, перастаць падпарадкоўвацца яму. Мінусам свабодных элекцыі было аслабленне дзяржавы. У час бескаралеўя Рэчы Паспалітай пагражала інтэрвенцыя, а падвойныя элекцыі прыводзілі да грамадзянскіх войнаў.

| |
|---|
| 3 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „за” і пазіцыю “супраць”, а таксама два аргументы, з якіх адзін – “за”, а другі – “супраць”. Абодва абапіраюцца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.<br><br>Прыняцце пазіцыі: *Толькі часткова згодны з прыведзеным меркаваннем. Мяркую, што выбар караля ў форме свабоднай элекцыі меў свае плюсы і мінусы.*<br><br>Аргумент 1: *Плюсам свабоднай элекцыі з’яўлялася ўзмацненне ўплыву падданых на ўладу.*<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: […] *у выпадку неэфектыўнага кіравання шляхта магла не падпарадкоўвацца каралю.*<br><br>Аргумент 2: *Мінусам свабодных элекцыі было аслабленне дзяржавы.*<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: *У час бескаралеўя Рэчы Паспалітай пагражала інтэрвенцыя, а падвойныя элекцыі прыводзілі да грамадзянскіх войнаў.* |

Прыклад 4.
Я не згодны з пададзеным меркаваннем. Выбар караля ў форме свабоднай элекцыі быў вельмі дрэнны, таму што ўлада такога караля была слабая. Кароль быў вымушаны рэалізаваць падпісаныя ў час элекцыі “Генрыхавыя артыкулы” і дзяліцца сваёй уладай з сеймам. Акрамя таго, з-за свабоднай элекцыі ў дзяржаве часта панаваў хаос, а сама дзяржава была слабая.

2 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю “супраць” і два аргументы, з якіх толькі адзін абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

Прыняцце пазіцыі: *Я не згодны з прыведзеным меркаваннем. Выбар караля ў форме свабоднай элекцыі быў вельмі дрэнны*

Аргумент 1: […] *улада такім чынам выбаранага* [у свабоднай элекцыі] *караля была слабая.*
Выкарыстане гістарычных ведаў: *Кароль быў вымушаны рэалізаваць падпісаныя падчас элекцыі “Генрыхавыя артыкулы” і дзяліцца сваёй уладай з сеймам.*

Аргумент 2: […] *з-за свабоднай элекцыі ў дзяржаве часта панаваў хаос, а сама дзяржава была слабая.*
Адсутнасць выкарыстання канкрэтных гістарычных ведаў.

Прыклад 5.
Я згодны з меркаваннем, што выбар караля ў форме свабоднай элекцыі быў добры для дзяржавы. Дзякуючы гэтаму ўся шляхта мела ўплыў на ўладара, таму што, паводле Генрыхавых артыкулаў”, магла яму не падпарадкавацца.

1 бал – выказванне прадстаўляе пазіцыю “за” і адзін аргумент, які абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

Прыняцце пазіцыі: *Я згодны з меркаваннем, што выбраны ў форме свабоднай элекцыі кароль быў добры для дзяржавы.*

Аргумент: *уся шляхта мела ўплыў на ўладара.*
Выкарыстане гістарычных ведаў: *паводле “Генрыхавых артыкулаў”, шляхта магла не падпарадкавацца ўладару.*

## Заданне 40. (0–3)

**Ці ты згодны з меркаваннем, што Лістападаўскае паўстанне мела шанец закончыцца перамогай? Напішы сваё меркаванне і прывядзі два аргументы, абапіраючыся на канкрэтныя гістарычныя веды.**

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

## Агульныя патрабаванні

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.

1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.
4. Тлумачэнне прычынна-выніковых сувязяў, аналіз з’яў і гістарычных працэсаў.

III. Стварэнне гістарычнага наратыву.

1. Канструяванне закончанай думкі з выкарыстаннем ведаў з адмысловых крыніц.
3. Прадстаўленне аргументаў на карысць уласнай пазіцыі наконт гістарычных працэсаў і постацяў.

## Адмысловыя патрабаванні

XX. Польскія землі ў 1815–1848 гадах. Вучань:

3) прадстаўляе прычыны выбуху Лістападаўскага паўстання, характар барацьбы […].

## Прынцыпы ацэньвання

3 балы – прадстаўленне думкі, падмацаванай двума аргументамі, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

2 балы – прадстаўленне думкі, падмацаванай двума аргументамі, з якіх толькі адзін абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

1 бал – прадстаўленне думкі, падмацаванай толькі адным аргументам, які абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

0 балаў – адсутнасць пазіцыі ці няправільны адказ або брак адказу.

## Прыклады ацэненых рашэнняў

Прыклад 1.

Я згодны з меркаваннем, што Лістападаўскае паўстанне мела шанец на перамогу. Па-першае, ў палякаў у Лістападаўскім паўстанні была рэгулярная армія, выдатна падрыхтаваная і ўзброеная вялікім князем Канстанцінам. Па-другое, польская армія атрымала некалькі перамог (напрыклад, пад Іганямі), ёй камандавалі выдатныя афіцэры (напрыклад, генерал I. Прандзінскі), так што паўстанцы мелі шанец на перамогу ў вайне з расіянамі.

3 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „за” і два аргументы, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

Прыняцце пазіцыі: *Я згодны з меркаваннем, што Лістападаўскае паўстанне мела шанец на перамогу.*

Аргумент 1: *У палякаў у Лістападаўскім паўстанні была рэгулярная армія* […].
Выкарыстане гістарычных ведаў: […]*У палякаў была рэгулярная армія, выдатна падрыхтаваная і ўзброеная вялікім князем Канстанцінам.*

Аргумент 2: *Польская армія атрымала некалькі перамог* […], таму што была *пад камандаваннем выдатных афіцэраў* […].

Выкарыстане гістарычных ведаў: […] *атрымала некалькі перамог (напрыклад, пад Іганямі)* […] *ёю камандавалі выдатныя афіцэры (напрыклад, генерал I. Прандзінскі).*

Прыклад 2.
Я не згодны з вышэйшым меркаваннем. Па-першае, Лістападаўскае паўстанне не мела шанцу закончыцца перамогай, таму што вайсковая перавага была на баку расіян (расійская армія па колькасці перавышала польскую, напрыклад, у бітве пад Грохавам 60 тыс. расіян ваявала з 40 тыс. палякаў).
Па-другое, польскае войска было пад камандаваннем людзей, якія не верылі ў перамогу (напрыклад, генерал Юзаф Хлапіцкі, генерал Ян Скшынэцкі), яны зрабілі сур'ёзныя памылкі і не выкарысталі шанцу на перамогу.

| |
|---|
| 3 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „супраць” і два аргументы, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.<br><br>Прыняцце пазіцыі: *Я не згодны з пададзеным меркаваннем. Лістападаўскае паўстанне не мела шанцу закончыцца перамогай* […].<br><br>Аргумент 1: […] *вайсковая перавага была на баку расіян.*<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: […] *расійская армія па колькасці перавышала польскую, напрыклад, у бітве пад Грохавам 60 тыс. расіян ваявала з 40 тыс. палякаў.*<br><br>Аргумент 2: *польскім войскам камандавалі людзі, якія не верылі ў перамогу* […].<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: *польскім войскам камандавалі* […] *камандзіры (напрыклад, генерал Юзаф Хлапіцкі, генерал Ян Скшынэцкі), якія зрабілі сур'ёзныя памылкі і не выкарысталі шанцу на перамогу.* |

Прыклад 3.
Лічу, што прыведзенае меркаванне слушнае, таму што ў паўстанцаў была рэгулярная армія. Таксама ў польскім войску былі выдатныя камандзіры, напрыклад Ігнат Прандзінскі і Юзаф Бэм, дзякуючы якім армія паўстанцаў атрымала некалькі перамог.

| |
|---|
| 2 балыы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „за” і два аргументы, з якіх толькі адзін абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.<br><br>Прыняцце пазіцыі: *Лічу, што прыведзенае меркаванне слушнае* […].<br><br>Аргумент 1: […] *у паўстанцаў была рэгулярная армія.*<br>Адсутнасць выкарыстання канкрэтных гістарычных ведаў.<br><br>Аргумент 2: У польскім войску былі выдатныя камандзіры,<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: [*камандзіры*], *напрыклад, Ігнат Прандзінскі і Юзаф Бэм, дзякуючы якім армія паўстанцаў атрымала некалькі перамог.* |

Прыклад 4.
Я не згодны з меркаваннем, што Лістападаўскае паўстанне мела шанец закончыцца перамогай, таму што Царства Польскае было слабейшае, чым Расія.

0 балаў – выказванне прадстаўляе пазіцыю „супраць” і толькі адзін аргумент, які не абапіраецца на гістарычныя веды.

Прыняцце пазіцыі: *Я не згодны з меркаваннем, што Лістападаўскае паўстанне мела шанец закончыцца перамогай* […].

Аргумент: […] *царства Польскае было слабейшае, чым Расія.*
Адсутнасць выкарыстання канкрэтных гістарычных ведаў.

Прыклад 5.
Лістападаўскае паўстанне пачалося 29 лістапада 1830 года. Яно было падрыхтавана ў падполлі, а ўзначаліў яго Пётр Высоцкі. Паўстанцы заатакавалі Бельведэр, а вялікі князь Канстанцін уцёк з Варшавы. У снежні 1831 года ў Царства Польскае ўвайшлі расійскія войскі і разбілі польскую армію. Паўстанне закончылася паразай палякаў.

0 балаў – няправільны адказ.

Адсутнасць спасылкі на меркаванне, запісанае ў заданні. Адсутнасць уласнага меркавання. Адказ абмяжоўваецца паданнем некаторых фактаў, частка з якіх нязгодная з гістарычнымі ведамі. У адказе вучня адсутнічае аргументацыя.

## Заданне 41. (0–3)

**Ці ты згодны з меркаваннем, што ўклад Злучаных Штатаў Амерыкі ў перамогу антыгітлераўскай кааліцыі ў Другой сусветнай вайне найбольшы? Напішы сваё меркаванне і прывядзі два аргументы, абапіраючыся на канкрэтныя гістарычныя веды.**

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

### Агульныя патрабаванні

II. Аналіз і гістарычная інтэрпрэтацыя.
   1. Крытычны аналіз інфармацыі з розных крыніц […], спроба зрабіць на яе падставе высновы.
   4. Тлумачэнне прычынна-выніковых сувязяў, аналіз з'яў і гістарычных працэсаў.

III. Стварэнне гістарычнага наратыву.
   Канструяванне закончанай думкі з выкарыстаннем ведаў з адмысловых крыніц.
   3. Прадстаўленне аргументаў на карысць уласнай пазіцыі наконт гістарычных працэсаў і постацяў.

## Адмысловыя патрабаванні

XXXIII. Другая сусветная вайна і яе этапы. Вучань:

1) прадстаўляе ды размяшчае ў часе і прасторы пераломныя (палітычныя і ваенныя) падзеі Другой сусветнай вайны;

3) тлумачыць прычыны паразы дзяржаў Восі.

## Прынцыпы ацэньвання

3 балы – прадстаўленне думкі, падмацаванай двума аргументамі, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

2 балы – прадстаўленне думкі, падмацаванай двума аргументамі, з якіх толькі адзін абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

1 бал – прадстаўленне думкі, падмацаванай толькі адным аргументам, які абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.

0 балаў – адсутнасць пазіцыі ці няправільны адказ або брак адказу.

## Прыклады ацэненых рашэнняў

Прыклад 1.

Лічу, што прыведзенае меркаванне цалкам слушнае. Уклад Злучаных Штатаў у выглядзе іх эканамічнага патэнцыялу ў перамогу антыгітлераўскай кааліцыі ў Другой сусветнай вайне самы вялікі. І Вялікабрытанія, і Савецкі Саюз карысталіся пастаўкамі амерыканскага абсталявання, ежы і фінансавай дапамогаю (праграма "Ленд-ліз"). Без гэтай дапамогі абедзве згаданыя дзяржавы не магі б перамагаць на фронце і, магчыма, былі б пераможаныя Гітлерам.

Больш за тое, амерыканцы мабілізавалі на вайну вялікія чалавечыя рэсурсы. Іх салдаты ваявалі на шматлікіх франтах, у тым ліку ў Еўропе, Афрыцы і Азіі. Параза Германіі не была б магчымая без высадкі ў Нармандыі (гэта значыць, удзелу амерыканцаў), а параза Японіі – без перамогі на Ціхім Акіяне (напрыклад, Мідуэй) ці атамнай бомбы вялікай сілы (скінутай на Хірасіму і Нагасакі).

| |
|---|
| 3 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „за" і два аргументы, кожны з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды.<br><br>Прыняцце пазіцыі: *Лічу, што прыведзенае меркаванне цалкам слушнае.*<br><br>Аргумент 1: *Злучаныя Штаты сваім эканамічным патэнцыялам унеслі самы вялікі ўклад у перамогу антыгітлераўскай кааліцыі ў Другой сусветнай вайне.*<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: *І Вялікабрытанія, і Савецкі Саюз карысталіся пастаўкамі амерыканскага абсталявання, ежы і фінансавай дапамогаю (праграма "Ленд-ліз").*<br><br>Аргумент 2: *Больш за тое, амерыканцы мабілізавалі на вайну вялікія чалавечыя рэсурсы.*<br>Выкарыстане гістарычных ведаў: *Іх салдаты ваявалі на шматлікіх франтах, у тым ліку ў Еўропе, Афрыцы і Азіі. Параза Германіі не была б магчымая без высадкі ў Нармандыі (гэта значыць, удзелу амерыканцаў), а параза Японіі – без перамогі на Ціхім Акіяне (напрыклад, Мідуэй) ці атамнай бомбы вялікай сілы (скінутай на Хірасіму і Нагасакі).* |

Прыклад 2.
Я не згодны з прыведзеным меркаваннем і мяркую, што Злучаныя Штаты не ўнеслі укладу ў перамогу антыгітлераўскай кааліцыі ў Другой сусветнай вайне. Самы вялікі ўплыў на перамогу над Гераманіяй меў Савецкі саюз. Савецкая армія нанесла войскам Трэцяга Рэйха самыя вялікія страты, заняла палову Еўропы і першая здабыла Берлін. Варта таксама адзначыць, што амерыканцы позна ўступілі ў вайну.

2 балы – выказванне прадстаўляе пазіцыю „супраць” і два аргументы, толькі адзін з якіх абапіраецца на правільна прыведзеныя гістарычныя веды

Прыняцце пазіцыі: *Я не згодны з прыведзеным меркаваннем.*

Аргумент 1: *Самы вялікі ўплыў на перамогу Гераманіі меў Савецкі саюз.*
Выкарыстане гістарычных ведаў: *Савецкая армія нанесла войскам Трэцяга Рэйха самыя вялікія страты, заняла палову Еўропы і першая здабыла Берлін.*

Аргумент 2: *Варта таксама адзначыць, што амерыканцы позна ўступілі ў вайну.*
Адсутнасць выкарыстання канкрэтных гістарычных ведаў.

Прыклад 3.
Мяркую, што Злучаныя Штаты на мелі найбольшага ўкладу ў перамогу антыгітлераўскай кааліцыі, таму што найвялікшы ўклад у перамогу над Германіяй зрабіў Савецкі Саюз. Гэта расіяне нанеслі немцам самыя вялікія страты і занялі Берлін, і ў гэтым дапамаглі ім таксама польскія салдаты.

1 бал – выказванне прадстаўляе пазіцыю „супраць” і адзін аргумент, які абапіраецца на гістарычныя веды.

Прыняцце пазіцыі: *Мяркую, што Злучаныя Штаты не мелі самага вялікага ўкладу ў перамогу антыгітлераўскай кааліцыі* […].

Аргумент: […]*таму што найвялікшы ўклад у перамогу над Германіяй зрабіў Савецкі Саюз.*
Выкарыстане гістарычных ведаў: *Гэта расіяне нанеслі немцам самыя вялікія страты і занялі Берлін, і ў гэтым дапамаглі ім таксама польскія салдаты.*

Прыклад 4.
Так, амерыканцы мелі самы вялікі ўдзел у перамозе над Гітлерам. Ніводная іншая краіна не зрабіла столькі для перамогі, колькі амерыканцы. Расіяне ўвесь час прайгравалі з Германіяй, а англічане перамаглі толькі ў бітве за Англію.

0 балаў – выказванне прадстаўляе пазіцыю „за” і адзін аргумент, які не абапіраецца на гістарычныя веды.

Прыняцце пазіцыі: *Так, амерыканцы мелі самы вялікі ўдзел у перамозе над Гітлерам.*
Аргумент: *Ніводная іншая краіна не зрабіла столькі для перамогі, колькі амерыканцы.*

## З рэцэнзій:

Прадстаўленыя ў *Даведніку* заданні вельмі цікавыя і разнастайныя. Яны даюць магчымаць праверыць усе ключавыя кампетэнцыі па прадмеце […]. У заданнях выкарыстаныя розныя віды гістарычных крыніц (у тым ліку тэкст, дыяграмы, карты, іканаграфія), як з эпохі, так і ў апрацаванай форме (комікс). Выкарыстанне апошніх тыпаў крыніц з'яўляецца дадатковай вартасцю, бо дазваляе паказаць вучню, што гісторыя – жывы прадмет, а падзеі мінулых эпох могуць быць крыніцаю натхнення для сучасных мастакоў і масавай культуры.

**др габ. Іяланта Хаінска-Міка, праф. ВУ**

[*Даведнік*] добра паказвае, што на экзамене па гісторыі будуць правярацца не толькі веды, але перш за ўсё разнастайныя навыкі вучняў, звязаныя з працай з крыніцамі і гістарычнымі працамі. У адпаведнасці з духам часу, асаблівы акцэнт робіцца на іканаграфічныя крыніцы.

**др габ. Іяланта Войдан, праф. УрУ**